✓**19 красавіка** ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Магія графікі»**, прымеркаваная да 75-годдзя вядомага беларускага мастака Валерыя Слаука. Валерый Пятровіч – аўтар сотняў візуальных увасабленняў беларускіх і замежных фальклорных персанажаў, аўтарскіх фантастычных сюжэтаў. Містычныя вобразы яго герояў зачароўваюць не адно пакаленне дзяцей і бацькоў. У экспазіцыі наведвальнікі могуць убачыць традыцыйныя казачныя вобразы сусветнай і беларускай міфалогіі – любімую тэму мастака. Сярод работ – харызматычныя каты, казуркі, чараўнікі, дамавікі, волаты, русалкі, вадзянікі і іншыя фантастычныя стварэнні.

Выстава будзе працаваць да 1 ліпеня.